

# НА ФУТБОЛЬНАЕ РАНДЭВУ

## У Францыі заўтра стартуе 15-ты чэмпіянат Еўропы

**Упершыню на падобным турніры згуляюць 24 каманды, 23 з іх адабраліся ў фінальную частку з 54 зборных краін Еўропы, да іх далучылася гаспадыня — Францыя, якая, дарэчы, ужо ў трэці раз прымае кантынентальнае першынство. Гульні пройдуць адразу ў дзесяці гарадах (Сэн-Дэні, Марсэль, Ліён, Парыж, Ліль, Ланс, Бардо, Сэнт-Эцьен, Тулуза і Ніца). Матч адкрыцця (10 чэрвеня) і фінал (10 ліпеня) адбудуцца на найбуйнейшым стадыёне краіны ў прыгарадзе Парыжа — «Стад дэ Франс», паўфінальныя матчы пройдуць на стадыёнах Ліёна і Марсэля.**

Талісманам Еўра-2016 стаў хлопчык-футбаліст у форме зборнай Францыі з гульнявым нумарам 16. Акрамя сіне-белай формы ў яго ёсць і чырвоны плашч, гэта значыць, выкарыстаныя ўсе нацыянальныя колеры французаў. **Імя талісмана** выбіралі шляхам галасавання і назвалі яго **Супер Віктар**, талісман будзе прысутнічаць на ўсіх матчах будучага турніру. **Афіцыйны слоган чэмпіянату «Le Rendez-Vous», гэта значыць «Рандэву»**.

Здзейснім невялікі экскурс у гісторыю. Футбольныя чэмпіянаты Еўропы праводзяцца з 1960 года, раз у 4 гады. Першапачаткова турнір называўся Кубак еўрапейскіх нацый, а праз 8 гадоў змяніў сваю назву. Першы фінал прайшоў якраз у Парыжы паміж СССР і Югаславіяй. Перамогу святкавала зборная СССР, савецкія футбалісты забілі пераможны мяч у дадатковы час. Цяпер лідарамі чэмпіянатаў з'яўляюцца зборныя Іспаніі і Германіі, на рахунку кожнай каманды па тры перамогі. Спіс лепшых бамбардзіраў узначальвае Мішэль Плаціні, у яго активе 9 галоў.

Беларускія аматары футбола змогуць назіраць за чэмпіянатам як па тэлевізары, так і ў фан-зоне, якая размесціцца ў мінскім парку Перамогі на набярэжнай Свіслачы. Матчы там будуць трансліравацца на вялікіх экранах, акрамя прагляду гульняў, арганізатары абяцаюць сустрэчы з вядомымі людзьмі са свету футбола, майстар-класы ад спартыўных каментатараў, кікер, фотаатракцыёны, конкурс прагнозаў, спаборніцтвы на спрытнасць валодання футбольным мячом і нават моўныя курсы «футбольнай» беларускай.

Адзначым, што Белтэлерадыёкампанія пакажа ўсе матчы чэмпіянату Еўропы. Сёння адбудзецца афіцыйнае адкрыццё кантынентальнага першынства, «Беларусь 5» будзе трансліраваць у прамым эфіры святочны канцэрт на Марсавым полі, дзе каля Эйфелевай вежы будзе дадзены старт чэмпіянату. Матч-адкрыццё Францыя — Румынія ўбачым на тым жа тэлеканале ўжо 10 чэрвеня, у далейшым з 11 па 18 чэрвеня матчы групавога раўнда будуць трансліравацца каналам «Беларусь 5» штодня ў 15.55 і 18.55, а таксама каналам «Беларусь 1» у 21.55.

### ЦІКАВЫЯ ФАКТЫ ПРА ЕЎРА:

- Самы хуткі гол забіў расіянін Дзмітрый Кірычэнка на Еўра-2004 у матчы Расіі супраць зборнай Грэцыі (67-я секунда);
- самае гучнае паражэнне за ўвесь час правядзення чэмпіянатаў Еўропы пацярпела каманда Італіі ў паядынку са зборнай Іспаніі ў 2012 годзе. Тады італьянцы прайгралі з лікам 0:4;
- Еўра-1976 на гэты момант з'яўляецца адзіным, у фінальнай гульні якога мела месца серыя пенальці. Тады зборная Чэхаславакіі атрымала перамогу над камандай ФРГ;
- кубак Анры Дэланэ, які атрымлівае чэмпіён Еўропы, названы ў гонар першага генеральнага сакратара УЕФА. Ён упершыню прапанаваў правядзенне еўрапейскага першынства, але памёр у 1955 годзе за 5 гадоў да першага чэмпіянату Еўропы. Яго сын, П'ер Дэланэ, быў адказным за стварэнне трафея. Кубак зроблены парыжскім ювелірам Мішэлем Шабіёнам. Пачынаючы з першага ў гісторыі турніру, чэмпіён узнагароджваўся кубкам Анры Дэланэ і захоўваў яго 4 гады, да наступнага чэмпіянату Еўропы;
- у 2000 годзе ўпершыню чэмпіянат Еўропы прымалі адразу дзве краіны — Бельгія і Нідэрланды;
- у 2004 годзе замест «залатога гола» ўвялі правіла «сярэбранага гола». У 2008 годзе правіла адменена;
- 18 зборных гулялі ў паўфінале, 12 зборных даходзілі да фінальнага матчу і 9 каманд станавіліся чэмпіёнамі;
- на кожным чэмпіянаце Еўропы выступала хоць адна новая каманда. З іх 7 зборных былі гаспадарамі чэмпіянату;
- самы выніковы чэмпіянат быў у 2000 годзе, там забіта 85 галоў;
- зборная Іспаніі — адзіная каманда, якая абараніла тытул чэмпіёна Еўропы (у 2012 годзе). Да гэтага шанц двойчы запар стаць пераможцамі Еўра быў у СССР у 1964 годзе і ў ФРГ у 1976 годзе, але яны прайгралі ў фінальных матчах;
- на сёлетнім чэмпіянаце кожны ўдзельнік атрымае мінімум 8 мільёнаў еўра, а калі каманда выйграе ўсе свае матчы і турнір адпаведна, то яе казна папоўніцца на 27 мільёнаў. Увогуле, на Еўра-2016 арганізатары вылучылі 301 мільён еўра;
- у 2020 годзе чэмпіянат Еўропы па футболе пройдзе ў 13 найбуйнейшых гарадах Еўропы.





| Дата | Час | Канал | Каманды |
|---|---|---|---|
| 10 чэрвеня, пятніца | 21:55 | Беларусь 1 | Францыя — Румынія |
| 11 чэрвеня, субота | 15:55 | Беларусь 5 | Албанія — Швейцарыя |
| | 18:55 | Беларусь 5 | Уэльс — Славакія |
| | 21:55 | Беларусь 1 | Англія — Расія |
| 12 чэрвеня, нядзеля | 15:55 | Беларусь 5 | Турцыя — Харваты |
| | 18:55 | Беларусь 5 | Польшча — Паўночная Ірландыя |
| | 21:55 | Беларусь 1 | Германія — Украіна |
| 13 чэрвеня, панядзелак | 15:55 | Беларусь 5 | Іспанія — Чэхія |
| | 18:55 | Беларусь 2 | Ірландыя — Швецыя |
| | 21:55 | Беларусь 1 | Бельгія — Італія |
| 14 чэрвеня, аўторак | 18:05 | Беларусь 5 | Аўстрыя — Венгрыя |
| | 21:55 | Беларусь 1 | Партугалія — Ісландыя |
| 15 чэрвеня, серада | 15:55 | Беларусь 5 | Расія — Славакія |
| | 18:55 | Беларусь 5 | Румынія — Швейцарыя |
| | 21:55 | Беларусь 1 | Францыя — Албанія |
| 16 чэрвеня, чацвер | 15:55 | Беларусь 5 | Англія — Уэльс |
| | 18:55 | Беларусь 5 | Украіна — Паўночная Ірландыя |
| | 21:55 | Беларусь 1 | Германія — Польшча |
| 17 чэрвеня, пятніца | 15:55 | Беларусь 2 | Італія — Швецыя |
| | 18:55 | Беларусь 5 | Чэхія — Харватыя |
| | 21:55 | Беларусь 1 | Іспанія — Турцыя |
| 18 чэрвеня, субота | 15:55 | Беларусь 5 | Бельгія — Ірландыя |
| | 18:55 | Беларусь 5 | Ісландыя — Венгрыя |
| | 21:55 | Беларусь 1 | Партугалія — Аўстрыя |
| 19 чэрвеня, нядзеля | 21:55 | Беларусь 1 | Швейцарыя — Францыя |
| | | Беларусь 5 | Румынія — Албанія |
| 29 чэрвеня, панядзелак | 21:55 | Беларусь 1 | Расія — Уэльс |
| | | Беларусь 5 | Славакія — Англія |
| 21 чэрвеня, аўторак | 18:55 | Беларусь 2 | Украіна — Польшча |
| | 21:55 | Беларусь 1 | Харватыя — Іспанія |
| | | Беларусь 5 | Чэхія — Турцыя |
| | 23:55 | Беларусь 5 | Паўночная Ірландыя — Германія |
| 22 чэрвеня, серада | 18:55 | Беларусь 2 | Венгрыя — Партугалія |
| | 21:55 | Беларусь 1 | Швецыя — Бельгія |
| | | Беларусь 5 | Італія — Ірландыя |
| | 23:55 | Беларусь 5 | Ісландыя — Аўстрыя |
| 25 чэрвеня, субота | 15:55 | Беларусь 5 | 1/8 фіналу |
| | 18:55 | Беларусь 5 | 1/8 фіналу |
| | 21:55 | Беларусь 1 | 1/8 фіналу |
| 26 чэрвеня, нядзеля | 15:55 | Беларусь 5 | 1/8 фіналу |
| | 18:55 | Беларусь 5 | 1/8 фіналу |
| | 21:55 | Беларусь 1 | 1/8 фіналу |
| 27 чэрвеня, панядзелак | 18:55 | Беларусь 5 | 1/8 фіналу |
| | 21:55 | Беларусь 1 | 1/8 фіналу |
| 30 чэрвеня, чацвер | 21:55 | Беларусь 1 | 1/4 фіналу |

| ГРУПА А | ГРУПА В | ГРУПА С | ГРУПА D | ГРУПА Е | ГРУПА F |
|---|---|---|---|---|---|
| Францыя | Англія | Германія | Іспанія | Бельгія | Партугалія |
| Румынія | Расія | Украіна | Чэхія | Італія | Ісландыя |
| Албанія | Уэльс | Польшча | Турцыя | Ірландыя | Аўстрыя |
| Швейцарыя | Славакія | Паўн. Ірландыя | Харватыя | Швецыя | Венгрыя |

**У плэй-оф выходзяць каманды, якія занялі ў групах першае і другое месца, а таксама чатыры лепшыя каманды, якія занялі трэція месцы.**

Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ. lobazhevich@zviazda.by

ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

## АБУВАЎСЯ... НА ПРАЦЫ

### Прадавец крамы скраў 10 пар абутку

**За такое злачынства супрацоўнікамі аддзела крымінальнага вышуку Фрунзенскага РУУС сталіцы быў затрыманы прадавец абутковай крамы па вуліцы Каменнагорскай.**

Як было ўстаноўлена, 23-гадовы зламыснік здзяйсняў крадзяжы з сакавіка па красавік. Ён першы ранкам адчыняў краму, абутак складваў або ў сумку, або ў пакеты для смецця і выносіў на вуліцу. Далей хаваў здабычу за кантэйнерамі для смецця, каб пасля заканчэння працоўнай змены забраць яе. Усяго малады чалавек скраў дзесяць пар абутку на суму 17,5 мільёна рублёў. Усе дзеянні прадаўца запісалі камеры відэаназірання. Падчас разбору пяць пар абутку былі знойдзены па месцы жыхарства хлопца, астатнія, па словах маладога чалавека, ён выкінуў. Заведзена крымінальная справа, падазраванаму пагражае да чатырох гадоў пазбаўлення волі.

## ТАКОГА ФОТА ЛЕПШ НЕ МЕЦЬ

### Схаваныя камеры фіксуюць парушэнні

**З пачатку года пры дапамозе камер фотафіксацыі — так званых фотапастак — было выяўлена 35 парушэнняў прыродаахоўнага заканадаўства.**

Як расказалі ў прэс-службе Міністэрства лясной гаспадаркі, найбольш распаўсюджаныя артыкулы, якія парушаюцца, «Забруджванне лесу і іншай драўнінна-хмызняковай расліннасці», «Парушэнне правілаў нарыхтоўкі, збору ці закупкі грыбоў, іншых дзікарослых раслін ці іх частак», «Незаконнае знішчэнне, выманне ці пашкоджанне дрэў і кустоў ці іншай расліннасці».

Усяго ў лясным фондзе Мінлясгаса размешчаны 422 фотапасткі. Размяшчаюцца яны, як правіла, у месцах, якія найбольш актыўна наведвае насельніцтва. Фотапасткі надзейна схаваныя ад староннiх вачэй, да таго ж работнікі дзяржаўнай лясной аховы пастаянна мяняюць іх месцазнаходжанне.

Сяргей РАСОЛЬКА. rs@zviazda.by

## АЎТАКРЭСЛЫ РАТУЮЦЬ ЮНЫЯ ЖЫЦЦІ

**Больш чым у пяць разоў зменшылася гібель дзяцей на дарогах ад 2005 года.**

— Ад мінулага года, калі была заканадаўча замацавана норма аб адмысловай перавозцы дзяцей да 12 гадоў, дзіцячы траўматызм на дарогах рэзка пайшоў уніз. Акрамя таго, мы заўважылі цікавую тэндэнцыю. Калі раней 80% ДТЗ здараліся па віне юных удзельнікаў дарожнага руху, а не кіроўцаў, то цяпер сітуацыя перамянілася цалкам наадварот, — паведаміла **старшы інспектар па асобых даручэннях УДАІ МУС Ганна БАНАДЫК.**

Са студзень па красавік з айчынных дарог дадому не вярнуліся два дзіцяці. У пачатку красавіка ў Мазыры 20-гадовы мясцовы жыхар вёз на мапедзе 15-гадовага падлетка, якому днём пазней павінна было споўніцца 16. І не давёз — абодва атрымалі смяротныя траўмы. А на Воранаўшчыне нецвярозы бацька кіраваў аўтамабілем, на заднім сядзенні якога яго жонка трымала на руках двухгадовае дзіця. Машына апынулася ў кювеце. Бацькі траўмаў не атрымалі, а вось, хлопчык памёр праз гадзіну ў рэанімацыі...

Валяр'ян ШКЛЕННІК. schklennik@zviazda.by